View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository



Т.М. Тарасава, Мінск

**“Дзённікі” Максіма Танка як увасабленне быційнай цэласнасці пісьменніка**

“Дзённікі” Максіма Танка — гісторыя станаўлення асобы мастака, яго духоўнага жыцця, гэта дакумент пэўнай эпохі і часу. Адчуванне пісьменнікам непаўторнасці, самакаштоўнасці кожнага факта, падзеі, жыццёвай сітуацыі падштурхнула яго да напісання “Дзённікаў”. У запісах чытаем: “Дзённік патрэбен мне для маёй працы. Гэта — не магільнік маіх думак і пачуццяў, куды рэдка заглядае і сам пісьменнік, гэта — шлях з верставымі слупамі-паказальнікамі” [5, с. 406]; “Дзённік мой становіцца нястомным субяседнікам, якога магу разбудзіць у любы час ночы і працягваць бяседу — весці гэтыя хаатычныя запісы” [ 6, с. 216]. І калі аўтар у дзённіку здольны мужна агаліць жахлівую праўду гісторыі, то твор можа ператварыцца ў магутны дакумент свайго часу накшталт “Confessions” Ж.Ж. Русо.

Назва запісаў Максіма Танка “Дзённікі” мае як сэнсавую, так і жанравую скіраванасць. Гэта найперш аповед пра самога сябе, пра гісторыю індывідуальнага жыцця, гэта ідэнтычнасць аўтара і апавядальніка. Эмацыянальна-ацэначны кампанент слаба выяўлены ў запісах да 1970-х гадоў. З сярэдзіны 1980-х гг. у “Дзённіках” адчувальна ўзмацняецца ўвага да свайго ўнутранага жыцця.

Прынцыпам “шчырых прызнанняў” кіруецца Максім Танк у 1980 — 1990-я гг. Мастак не баіцца прызнавацца ў сваіх адмоўных якасцях, негатыўных ацэнках уласных учынкаў, у іранічным стаўленні да творчых пошукаў. Напрыклад, у “Дзённіках” за 1986 г. чытаем: “Засумаваў за добрымі вершамі, і сам іх развучыўся пісаць” [6, с. 504]; “За апошнія дні нічога не змог напісаць. Зацягнуўся мой творчы крызіс” [6, с. 514]. У 1994 г. Максім Танк піша: “Адчуваю, што ўвайшоў у самы цяжкі перыяд свайго жыцця — перыяд паражэнняў творчых, маральных, жыццёвых. Цяпер ужо позна на ўсім ставіць кропку. Застаецца толькі прайсці праз усе пякельныя кругі” [6, с. 744].

Варта заўважыць, што сучасная аўтабіяграфічная проза мае ўстойлівую тэндэнцыю да самаагалення. Прынцып шчырага прызнання ў благіх учынках, крамольных думках, глыбінны псіхааналіз як метад спасціжэння ўнутранага свету “я” пазбаўляюць аўтабіяграфію табуіраваных тэм, пашыраюць сферы духоўнага жыцця “я”. У “Дзённіках”

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Максіма Танка паступова раскрываецца ўся складанасць чалавечага "я"-асобы. Увага да падрабязнасцей душэўных пакут, уласцівая рускай класічнай традыцыі і лепшым узорам беларускай прозы ХХ ст., у запісах Максіма Танка 1990-х гг. набывае трагічнае гучанне: "Пры ўсім аптымізме мяне чамусьці не пакідае трагізм існавання" [5, с. 430].

У канцы 80-х гг. ХХ ст. інтанацыі ў "Дзённіках" мяняюцца. Балючае адчуванне крызіснасці жыцця, душэўныя пакуты, прадчуванне завершанасці зямнога быцця выклікаюць у аўтара мінорны настрой, абвостранае ўспрыманне Часу як галоўнага Суддзі, які разважыць, ацэніць, захавае альбо адправіць у нябыт.

Напрыканцы жыцця Максім Танк выразна ўсведамляе, што "жыццё — драма"; пра гэта сведчаць і дзённікавыя занатоўкі, і два апошнія зборнікі паэта "Мой каўчэг" і "Errata". У лютым 1994 г. мастак пакінуў такі запіс у дзённіку: "Калісьці людзі майго пакалення часы свае называлі часамі пагарды. Зараз мы ўступілі ў часы адчалавечання. І хоць, здавалася б, з нацыянальным адраджэннем, вяртаннем да рэлігіі павінна б было наступіць маральнае і духоўнае аднаўленне, на вялікі жаль, мы гэтага не бачым" [6, с. 694].

Няспынны пошук цэласнасці асобы, унутранай гармоніі, "пафас пакутлівай барацьбы за выздараўленне, за пабудову недабудаванага "я", па словах С. Аверынцава, "…противостоит как благодушным иллюзиям наличности искомого, так и нигилизму" [1, с. 132]. Расказ пісьменніка аб сваім мінулым у 90-я гг. ХХ ст. дапаўняецца споведдзю, у якой мы назіраем павелічэнне, як трапна зазначыў М. Бахцін, "…удельного веса событий интимно-личной жизни, … которые при громадном значении в личной жизни данного человека имеют ничтожное значение для других и почти вовсе не имеют социально-политического значения" [2, с. 73]. Але ў тым і ёсць каштоўнасць "Дзённікаў" Максіма Танка, што яны адкрываюць магчымасць спасцігнуць таямніцы экзістэнцыяльнага пісьменніцкага "я" ў свеце.

У занатоўках Максіма Танка прысутнічае ўзаемадзеянне лірычна-іранічнай экспрэсіі з філасофскай медытацыяй. Лірычная экспрэсія скіроўвае на прыхільнасць аўтара да прадмета аповеду альбо ўказвае на сітуацыю, не абыякавую для аўтара, у той час як іранічнае адценне сведчыць аб несупадзенні ацэнак у мінулым і цяперашнім часе. Важнай уласцівасцю аўтабіяграфічнага твора пісьменніка 90-х гг. ХХ ст. з'яўляецца адкрытая суб'ектыўнасць дзённіка і характэрная для яе экспрэсіўная

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

накіраванасць. Мастак слова не хавае ўласных пачуццяў закінутасці, адчужанасці, неабароненасці перад маштабам сацыяльных зрухаў канца стагоддзя. Будучы чалавекам сацыяльна актыўным, ён імкнуўся захаваць сябе як творцу. У “Дзённіках” чытаем: “Цікава, што мяне часта наведвае пачуццё адзіноцтва. Адкуль яно?” [5, с. 403]; “Засядаю і засядаю. Прападзі ты пропадам такая работа!” [6, с. 129]; “…Творчая праца патрабуе часу, часу і часу, адзіноцтва, адзіноцтва і адзіноцтва. А ў мяне на працягу ўсяго жыцця не хапала ні таго, ні другога” [6, с. 254].

Адзінота для Максіма Танка— не толькі абавязковая ўмова для творчасці. Гэта яшчэ і паказчык самакаштоўнасці асобы, умова захавання яе ўнутранага свету, праз яе адкрываецца шлях да людзей. Адзінота ёсць не супрацьстаянне асобы і грамадства, “…одиночество— это совершенно необходимое условие для самоуглубления личности. Для самопознания, для определения ее ценности: вне одиночества нет поэта. И более того, мера одиночества, как ни парадоксально, способность к самоуглублению через одиночество — порой и показатель самоценности личности поэта, и показатель меры его таланта”, — як зазначае расійскі даследчык В. Заманская [3, с. 175]. Анталагічнае пачуццё адзіноты ідзе ад вострага адчування беларускім паэтам неабходнасці суаднесці міг і вечнасць, спасцігнуць кошт імгнення і чалавечага жыцця. “Дзённікі” Максіма Танка ёсць матэрыялізаваная ідэя завершанасці кола зямнога быцця, незваротнасці часу і чалавека ў ім.

Дзённік Максіма Танка сведчыць пра тое, што інтэнсіўны духоўны рост пісьменніка быў працяглы. Аўтарскі вобраз зазнаў істотныя змены: адбылася яго семантычная трансфармацыя. У другой палове жыцця Максім Танк даражыць кожным пражытым імгненнем, час у некаторых запісах сціснуты да экзістэнцыі, “до субъективного переживания мимолетности бытия” [4, с. 97], душэўныя перажыванні становяцца больш каштоўнымі за штодзённыя клопаты, за сямейнае жыццё. Аператыўная хранікальнасць саступае месца моцнаму суб'ектыўнаму тону. Да перабудовачнага часу назіралася дынаміка ўзаемаадносін аўтара з сацыяльным асяроддзем, пасля перабудовы працуе метад псіхалагічнага самараскрыцця: тут і няўпэўненасць, ваганні, самакрытыка, адкрытыя і ў падтэксце, павялічылася колькасць рытарычных пытанняў, усё часцей аўтар ставіць шматкроп'е. У сістэме экзістэнцыяльных каардынат гэта называецца “матывам маўчання”, недагаворваннем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Такім чынам, дзённікавыя запісы Максіма Танка давалі магчымасць аўтару ажыццяўляць розныя формы і ўзроўні самааналізу і сведчаць, што індывідуальны свет пісьменніцкага “я” настолькі прывабна чароўны, што ён здольны стварыць арыгінальную мастацкую цэласнасць. “Жить — это не так просто, это быть вершиной ... Мы — произведения. П р о и з в е д е н и я” [7, p. 102], — канстатуе сучасны французскі пісьменнік Ж.-М.-Г. Леклезіё. Прыватнае жыццё мастака слова ў “Дзённіках” з самымі дробнымі дэталямі і падрабязнасцямі паўстае як паўнавартасны мастацкі твор, які здольны выявіць найскладанейшую сэнсавую множнасць асобы пісьменніка з яе глыбіннымі лірыка-філасофскімі перажываннямі.

Спіс літаратуры:

1. Аверинцев, С. “Аналитическая психология” К.-Г. Юнга и закономерности творческой фантазии / С. Аверинцев // Вопр. лит. – 1970. – № 3. – С. 113–143.

2. Бахтин, М.М. Эпос и роман : сборник / М.М. Бахтин. – СПб. : Азбука, 2000. – 304 с.

3. Заманская, В.В. Экзистенциальная традиция в русской литературе XX века: диалоги на границах столетий : учеб. пособие для вузов : для студентов, аспирантов, преподавателей-филологов / В.В. Заманская. – М. : Флинта : Наука, 2002. – 303 с.

4. Егоров, О.Г. Дневники русских писателей XIX века : исследование / О.Г. Егоров. – М. : Флинта : Наука, 2002. – 288 с.

5. Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк ; рэдкал.: У.В. Гніламёдаў [і інш.] ; прадм. В.В. Зуёнка ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012. – Т. 9 : Лісткі календара. Дзённікі (1941–1959). – 2009. – 592 с.

6. Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк ; рэдкал.: У.В. Гніламёдаў [і інш.] ; прадм. В.В. Зуёнка ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012. – Т. 10 : Дзённікі (1960–1994). – 2010. – 919 с.

7. Le Clezio, J.M.G. L'Extase matérielle / J.M.G. Le Clezio. – Paris : Gallimard, “Le Chemin”, 1967. – 229 p

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ